ПЕРАКЛАД

# СУСВЕТНЫ ДОМ СПРАВЯДЛІВАСЦІ
Сусветны Цэнтр Бахаі

Красавік 2002

РЭЛІГІЙНЫМ ЛІДЭРАМ СУСВЕТУ

Сутнасць трывалай спадчыны XX стагоддзя ў тым, што яно змусіла народы сусвету пачаць разглядаць сябе чальцамі адзінага роду людскога, і зямлю як ягоную агульную айчыну. Нягледзячы на няспынныя канфлікты і гвалт, якія азмрочваюць далягляд, прымхі, што некалі здаваліся ўласцівымі чалавечай прыродзе, усюды адступаюць. З імі разбураюцца перашкоды, якія доўга дзялілі сям’ю людзей на Вавілон асобаў, раз’яднаных па прымеце культурнага, этнічнага ці нацыянальнага паходжання. Тое, што гэтая карэнная змена магла адбыцца ў такі кароткі тэрмін, – па сутнасці незаўважны ў перспектыве гістарычнага часу, – наводзіць на думку аб значнасці магчымасцяў на будучыню.

Як ні прыкра, арганізаваная рэлігія, сапраўдны сэнс існавання якой заключаецца у служэнні справе братэрства і міру, вельмі часта паводзіць сябе як найбольш цяжкапераадольная перашкода на шляху; спашлемся на пэўны балючы факт, што яе імя доўга было прыкрыццём для фанатызму. Мы, як кіруючая рада адной з сусветных рэлігій, адчуваем адказнасць за паскарэнне сур’ёзнага разгляду гэтай складанай задачы, што паўстае перад рэлігійнымі лідэрамі. І праблема, і вынікі, да якіх яна прывяла, патрабуюць, каб мы выказаліся шчыра. Мы верым, што супольнае служэнне Богу стане залогам таго, што сказанае намі будзе ўспрынята ў тым жа духу добрай волі, у якім яно подана.

Пытанне набывае выразныя абрысы, калі разглядаюцца дасягненні ў іншых галінах жыцця. За паасобнымі выняткамі, у мінулым жанчыны лічыліся істотамі другога гатунку, іхняя сутнасць была агорнута забабонамі, ім было адмоўлена ў магчымасці выяўляць здатнасці чалавечага духу, а іхняя роля была зведзена да служэння патрэбам мужчынаў. Відавочна, ёсць шмат грамадстваў, дзе гэткія ўмовы захоўваюцца і нават фанатычна абараняюцца. Аднак, разважаючы пра глабальны ўзровень, ідэя роўнасці палоў набыла зараз моц агульнапрынятага прынцыпу практычна ва ўсіх аспектах жыцця. Яна прызнаецца бальшынёй акадэмічных суполак і сродкаў масавай інфармацыі. Перагляд стаў такім грунтоўным, што прыхільнікі мужчынскай перавагі мусяць шукаць падтрымкі ў тых, чые погляды знаходзяцца на ўскрайках цвярозага розуму.

Акружаныя батальёны нацыяналізму сутыкнуліся з падобным лёсам. З кожным крызісам, які адбываецца ў сусветных справах, грамадзяніну робіцца лягчэй адрозніваць любоў да краіны, любоў, якая абагачае ягонае жыццё, ад пакоры падбухторваючым прамовам, прызначаным выклікаць нянавісць да іншых і страх перад імі. Нават там, дзе ўдзельнічаць у звычных нацыяналістычных рытуалах выгадна, грамадскі водгук часта адзначаны не толькі цвёрдымі пераканаманнямі і спантаным энтузіязмам былых часоў, але і пачуццямі няёмкасці. Уздзеянне ўзмоцнена пераўтварэннямі, якія ўвесь час адбываюцца ў міжнародным парадку. Якія б ні былі заганы сістэмы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый у яе сучасным выглядзе, і якімі б абмежаванымі ні былі яе магчымасці ў прыняцці супольных ваенных мераў супраць агрэсіі, ніхто не можа сказіць той факт, што фетыш абсалютнай нацыянальнай незалежнасці знаходзіцца на шляху да знікнення.

Малацярпімыя да падобных прэтэнзій гістарычныя працэсы гэтак жа абышліся з расавымі і этнічнымі прымхамі. Тут непрыманне мінулага стала асабліва рашучым. Зараз расізм настолькі заплямлены сваёй повяззю з жахамі XX стагоддзя, што ён ужо ўспрымаецца як нешта кшталту духоўнай хваробы. Нягледзячы на тое, што расавая прымха, якой, як праказай, пашкоджана значная частка чалавецтва, пакуль што не выкаранена як грамадская пазіцыя у шматлікіх частках сусвету, яна стала настолькі

ўсеагульна асуджанай у прынцыпе, што ніякая суполка людзей больш не можа бяспечна дазволіць сабе атаясамліваццa з ёй.

Нельга сказаць, што цёмнае мінулае было сцёртае, і раптоўна нарадзіўся новы сусвет святла. Вялікая колькасць людзей працягвае цярпець вынікі ўкаранелых прымхаў наконт паходжання, полу, нацыянальнасці, касты ці класа. Уся рэчаіснасць паказвае, што гэткая несправядлівасць будзе захоўвацца доўга, паколькі ўстановам і нормам, якія распрацоўвае чалавецтва, вельмі марудна даецца магчымасць пабудаваць новы парадак узаемаадносін і прынесці палёгку прыгнечаным. Справа хутчэй у тым, што мы перайшлі парог, вярнуцца за які немагчыма. Асноўныя прынцыпы былі вызначаны, выразна вымаўлены, сталі шырока вядомымі і паступова ўвасабляюцца ва ўстановы, здольныя налажыць іх на грамадскія паводзіны. Няма сумнення ў тым, што якой бы працяглай і балючай ні была гэтая барацьба, узаемаадносіны паміж усімі народамі ў выніку зменяцца карэнным чынам на міжасобасным узроўні.

*

На пачатку XX стагоддзя здавалася, што рэлігійныя прымхі, хутчэй за ўсе астатнія, саступяць сілам зменаў. На Захадзе навуковыя дасягненні ўжо груба абышліся з некаторымі з цэнтральных стаўпоў сэктанцкай выключнасці. У кантэксце пераўтварэння, якое адбываецца ў самаўсведамленні роду людскога, найбольш шматабяцальным новым рэлігійным развіццём здаваўся межрэлігійны рух. У 1893 годзе Сусветная выстава ў Чыкага здзівіла нават яе славалюбных арганізатараў тым, што дала пачатак славутаму Парламенту Рэлігій, увасабленню духоўнай і маральнай згоды, якая захапіла ўяўленне народаў на ўсіх кантынентах і здолела зацміць нават навуковыя, тэхналагічныя і гандлёвыя цуды, якія ўслаўляла выстава.

Карацей кажучы, здавалася, што абрушыліся старадаўнія муры. Для ўплывовых мысляроў у рэлігійнай галіне гэта сустрэча стала ўнікальнай, «беспрэцэдэнтнай у гісторыі сусвету». Парламент, па словах ягонага выдатнага галоўнага арганізатара, «вызваліў сусвет ад нецярпімасці». Упэўнена прадказвалася, што адораныя ўяўленнем лідэры скарыстаюць магчымасць і абудзяць у рэлігійных суполках планеты, што доўга былі раздзеленымі, дух братэрства, які зможа забяспечыць неабходнае маральнае абгрунтаванне для новага сусвету – сусвету росквіту і прагрэсу. Укараняліся і квітнелі падбадзёраныя такім чынам разнастайныя межрэлігійныя рухі. Разнастайная літаратура, даступная на шмат якіх мовах, знаёміла найшырэйшую грамадскасць, як веруючых, так і няверуючых, з вучэннямі ўсіх асноўных рэлігій, гэтая цікавасць была у свой час падхоплена радыё, тэлебачаннем, кіно і, урэшце, Інтэрнэтам. Вышэйшыя навучальныя ўстановы пачалі акадэмічныя праграмы вывучэння параўнальнага рэлігіязнаўства. Пад канец стагоддзя межрэлігійныя малітоўныя службы, якіх нельга было ўявіць яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму, сталі звычайнай практыкай.

На жаль, відавочна, што гэтым ініцыятывам не хапае як інтэлектуальнай паслядоўнасці, так і духоўнай адданасці. У адрозненне ад працэсаў аб’яднання, якія пераўтвараюць рэшту грамадскіх узаемаадносін чалавецтва, укаранелыя ўзоры сэктанцкага мыслення ўпарта супрацьстаяць думцы, што ўсе асноўныя рэлігіі маюць роўную сілу па прыродзе і паходжанню. Хада расавай інтэграцыі – гэта развіццё, якое зяўляецца не проста выяўленнем чуллівасці альбо стратэгіі, але паўстае з усведамлення таго, што народы сусвету складаюць адзіны від, чые шматлікія адрозненні самі па сабе не даюць ніякіх перавагаў і не накладаюць ніякіх абмежаванняў на асобных прадстаўнікоў роду. Эмансіпацыя жанчын таксама выклікала гатоўнасць як грамадскіх устаноў, так і грамадскай думкі, прызнаць, што няма прыймальных падстаў – біялагічных, грамадскіх альбо маральных – для апраўдання адмаўлення жанчынам у цалкам роўных правах з мужчынамі, а дзяўчынкам – у роўных з хлопчыкамі адукацыйных магчымасцях. Ушанаванне ўкладу пэўных нацый у фармаванне сусветнай цывілізацыі, якая развіваецца,

не спрыяе атрыманай у спадчыну ілюзіі, нібыта іншыя нацыі мала альбо нічога не могуць зрабіць у гэтым напрамку.

Здаецца, што большая частка рэлігійных лідэраў не здольная распачаць такую грунтоўную пераарыентацыю. Іншыя часткі грамадства прымаюць плён адзінства чалавецтва не толькі як непазбежны наступны крок у развіцці цывілізацыі, але як вынік станаўлення меншых разнастайных супольнасцей, з якімі наш род уступіў у гэты вырашальны момант нашай агульнай гісторыі. Аднак, большая частка арганізаваных рэлігій стаіць паралізаваная на парозе будучыні, ахопленая тымі ж самымі догмамі і прэтэнзіямі на прывілейны доступ да ісціны, якія нясуць адказнасць за стварэнне найбольш бязлітасных кафліктаў, што раз’ядноўваюць насельніцтва зямлі.

Вынікі для дабрабыту чалавецтва былі разбуральнымі. Безумоўна, няма патрэбы спасылацца на падрабязнасці жахаў, якія сёння напаткалі няшчаснае чалавецтва з-за выбухаў фанатызму, які ганьбіць імя рэлігіі. І гэта не новая з’ява. Адзін з шматлікіх прыкладаў – рэлігійныя войны ў Еўропе XVI стагоддзя, якія каштавалі гэтаму кантыненту жыцця амаль трыццаці адсоткаў яго насельніцтва. Трэба задумацца над тым, што, у гістарычнай перспектыве, вырасла з насення, пасаджанага ў грамадскай свядомасці сляпымі сіламі сэктантскага дагматызму, якія выклікалі гэтыя канфлікты.

Да гэтага пераліку трэба дадаць здраду жыццю розума, якая больш, чым які-небудзь іншы чыннік, пазбавіла рэлігію яе спадчыннай здольнасці – іграць вырашальную ролю ў фармаванні сусветных спраў. Занятыя пытаннямі, што распыляюць і псуюць высілкі людзей, рэлігійныя інстытуты вельмі часта былі галоўнымі сіламі, якія стрымлівалі дослед рэчаіснасці і выкарыстанне ўласцівых чалавецтву разумовых здольнасцей. Ганьбаванні матэрыялізму альбо тэрарызму не дапамогуць па-сапраўднаму справіцца з сучасным маральным крызісам, калі яны не пачнуцца са шчырага прызнання няздольнасці выканаць свой абавязак, праз што масы вернікаў засталіся безабароннымі і прыступнымі для гэтых уздеянняў.

Якімі бы балючымі ні былі гэтыя разважанні, яны не столькі абвінавачанне арганізаванай рэлігіі, колькі напамін пра надзвычайную сілу, якую яна прадстаўляе. Як нам усім вядома, рэлігія дасягае каранёў чалавечых матываў. Калі яна заставалася вернай духу і прыкладу надзвычайных Асобаў, якія далі сусвету вялікія сістэмы веравання, яна абуджала ва ўсіх жыхарах здольнасці любіць, дараваць, ствараць, рызыкаваць, пераадольваць прымхі, ахвяраваць дзеля агульнага дабра і стрымліваць парывы жывёльных інстынктаў. Бясспрэчна, уплыў паслядоўнасці гэтых Боскіх Праяваў, што доўжыцца ад золку запісанай гісторыі, стаў той плённай сілай, якая зрабіла чалавека культурным.

Тая ж сіла, што гэтак эфектыўна дзейнічала ў мінулыя стагоддзі, застаецца нязгаснай асаблівасцю чалавечай свядомасці. Насуперак усім перашкодам і амаль не атрымліваючы падтрымкі, яна працягвае натхняць незлічоныя мільёны на барацьбу за выжыванне і ўздымае ва ўсіх землях герояў і святых, чые жыцці з’яўляюцца найбольш пераканаўчым доказам прынцыпаў, якія знаходзяццацца ў пісаннях іх адпаведных рэлігій. Як паказвае цячэнне цывілізацыі, рэлігія таксама здольная глыбока ўплываць на лад грамадскіх узаемаадносін. Сапраўды, цяжка ўявіць якія-небудзь карэнныя дасягненні цывілізацыі, якія не атрымалі б маральны штуршок з гэтай вечнай крыніцы. Ці магчыма, каб праходжанне кульмінацыйнай стадыі ў шматтысячагадовым працэсе ўладкавання планеты магло адбывацца ў духоўным вакууме? Калі распустныя ідэялогіі, якім у толькі што мінулым стагоддзі была дана воля над нашым сусветам, не ўнеслі нічога іншага, яны канчаткова паказалі, што патрэбы нельга задаволіць альтэрнатывамі, якія ляжаць у межах чалавечага вынаходства.

*

Бахаула абагульніў задачы на сёння ў словах, напісаных больш за стагоддзе таму і шырока распаўсюджаных у прамежныя дзесяцігоддзі:

> Не можа быць ніякага сумнення у тым, што народы сусвету, незалежна ад роду альбо рэлігіі, чэрпаюць сваё натхненне з адной і той жа нябёснай Крыніцы і з'яўляюцца падданымі аднаго Бога. Розніцу паміж наказамі, па якім яны жывуць, трэба тлумачыць зменлівымі патрабаваннямі і неабходнасцямі веку, у які гэтыя наказы былі адкрытыя. Усе яны, апроч нямногіх, што вынікаюць з людской разбэшчанасці, былі загаданыя Богам і з'яўляюцца адлюстраваннем Ягонай Волі і Мэты. Паўстанце і, узброенныя сілай веры, разбейце ўшчэнт багоў вашых марных летуценняў, сейбітаў разладу сярод вас. Трымайцеся таго, што вас злучае і аб'ядноўвае.

Гэты зварот не заклікае да адмаўлення ад веры ў асноўныя ісціны кожнай з сусветных вялікіх сістэм веравання. Зусім наадварот. Вера мае свой ўласны наказ і з'яўляецца сваім уласным апраўданнем. Тое, ва што вераць альбо не вераць іншыя, не можа быць аўтарытэтам для кожнага асабістага сумлення, вартага гэтага імя. Вышэйпрыведзеныя словы недвухсэнсава заклікаюць да адмаўлення ад усіх тых прэтэнзій на выключнасць ці канчатковасць, якія, абвіваючы сваім карэннем жыццё духа, сталі адзіным найвялікшым чыннікам у задушэнні парываў аб'яднацца і ў спрыянні нянавісці і гвалту.

Мы верым, што калі рэлігійнае лідэрства мае значэнне ў сусветным грамадстве, што з'яўляецца з пераўтваральнага вопыту XX стагоддзя, рэлігійныя лідэры павінны адказаць на гэты гістарычны выклік. Відавочна, што расце колькасць людзей, якія пачынаюць усведамляць, што ісціна, якая ляжыць у аснове ўсіх рэлігій, па сваёй сутнасці адзіна. Гэтае разуменне ўзнікае не праз вырашэнне тэалагічных дыспутаў, але як інтуітыўнае ўсведамленне, народжанае знаёмствам з іншымі, што ўвесь час пашыраецца, і зараджаючымся прыняццем адзінства самой чалавечай сям'і. Па-за блытанінай рэлігійных дактрын, рытуалаў і збораў законаў, атрыманых у спадчыну ад знікаючых сусветаў, узнікае пачуццё, што духоўнае жыццё, – як і адзінства, якое выяўляецца ў розных нацыянальнасцях, родах і культурах, – складае адзіную, аднолькава даступную ўсім, неабмежаваную рэчаіснасць. Дзеля таго, каб гэтае рассеянае і ўсё яшчэ цьмянае адчуванне ўмацавалася і дзейсна спрыяла пабудове мірнага сусвету, трэба, каб яно атрымала шчырую падтрымку тых, ад каго, нават у цяперашні час, масы жыхароў зямлі шукаюць кіраўніцтва.

Безумоўна, паміж галоўнымі сусветнымі рэлігійнымі традыцыямі ёсць мноства адрозненняў у дачыненні да сацыяльных прадпісанняў і форм пакланення. Гэта наўрад ці магло быць іначай, улічваючы тыя тысячы год, на працягу якіх Боскія адкравенні з'яўляліся адно за адным і адказвалі на зменлівыя патрэбы цывілізацыі, якая безупынна развіваецца. Сапраўды, неад'емнай рысай пісанняў бальшыні асноўных рэлігій з'яўляецца выяўленне, у той альбо іншай форме, прынцыпу эвалюцыйнай прыроды рэлігіі. Нельга маральна апраўдаць абыходжанне з культурнай спадчынай, якая насамрэч узбагачае духоўны вопыт, як са сродкам абуджэння прымхаў і аддалення. Асноўнай задачай душы заўсёды будзе дослед рэчаіснасці, жыццё ў адпаведнасці з ісцінай, у якой яна перакананая, і аказанне поўнай павагі намаганням іншых рабіць гэтак жа.

Можна запярэчыць, што, калі ўсе вялікія рэлігіі прызнаюцца аднолькава Боскімі па паходжанню, вынікам будзе заахвочванне, альбо прынамсі садзейнічанне пераходу мноства людзей з адной рэлігіі ў другую. Праўда гэта ці не, гэта, безумоўна, мае другараднае значэнне ў параўнанні з магчымасцю, якую гісторыя нарэшце адкрыла перад тымі, хто ўсведамляе існаванне сусвету, які выходзіць за гэты зямны, і ў параўнанні з адказнасцю, якую гэтае ўсведамленне накладвае. Кожная з вялікіх рэлігій можа прывесці

ўражальны і пэўны доказ яе дзейснасці ў выхаванні маральнага характару. Такім жа чынам, ніхто не можа пераканаўча давесці, што дактрыны, звязаныя з пэўнай сістэмай вераванняў, больш альбо менш плённыя ў выкліканні нецярпімасці і забабонаў, чым тыя, якія звязаны з іншымі вераваннямі. Натуральна, што мадэлі паводзін і ўзаемадзеяння будуць падвяргацца няспыннаму працэсу зменаў у сусвеце, які аб’ядноўваецца, і, безумоўна, роля інстытутаў любога роду – прадумаць, як гэтым развіццём можна кіраваць у спрыяючым адзінству напрамку. Гарантыя таго, што вынік урэшце будзе трывалым – у духоўным, маральным і сацыяльным плане – палягае ў нязменнай веры ігнараваных мас насельніцтва зямлі ў тое, што сусвет кіруецца не капрызам чалавека, але любячай і нязменнай Боскай Воляй.

Разам з крышэннем бар’ераў, якія раздзяляюць народы, наш век стаў сведкай знікнення калісьці несакрушальнага мура, які, як меркавалася раней, заўсёды можа аддзяляць нябёснае жыццё ад зямнога. Пісанні ўсіх рэлігій заўсёды вучылі верніка разглядаць служэнне іншым не толькі як маральны абавязак, але як шлях наближэння душы да Бога. Паступовае пераўтварэнне грамадства надае сёння гэтаму звычнаму вучэнню новыя глыбіні сэнсу. Па меры таго, як векавечнае абяцанне сусвету, які жыве па прынцыпах справядлівасці, павольна набывае рысы рэалістычнай мэты, задавальненне патрэбаў душы і грамадства будзе ўсё больш і больш разглядацца як узаемадапаўняльныя аспекты сталага духоўнага жыцця.

Калі рэлігійныя лідэры падымуцца на выклік, якім з’яўляецца гэтае апошняе асэнсаванне, гэты водгук павінен пачацца з прызнання таго, што рэлігія і навука – дзве неабходныя сістэмы ведаў, з дапамогай якіх развіваюцца патэнцыяльныя магчымасці свядомасці. Далёкія ад барацьбы адна з адной, гэтыя асноўныя спосабы разумовага даследу рэчаіснасці ўзаемазалежаць, і былі найбольш плённымі ў тыя рэдкія, але шчаслівыя перыяды гісторыі, калі ўсведамлялася іхняя ўзаемадапаўняльная прырода, і яны былі здольныя працаваць разам. Ідэі і майстэрства, якія параждаюцца развіццём навукі, заўсёды будуць мець патрэбу ў духоўным і маральным кіраўніцтве, што забяспечаць іхняе прыдатнае скарыстанне; рэлігійным перакананням, якімі б паважанымі яны ні былі, трэба з ахвотай і ўдзячнасцю дазволіць бесстароннае выпрабаванне сябе навуковымі метадамі.

На заканчэнне мы падымаем пытанне, да якога падыходзім з пэўнай асцярогай, паколькі яно непасрэдна датычыцца сумлення. Сярод шматлікіх спакусаў, якія прапануе сусвет, выпрабаванне, якое зусім не выпадкова хвалюе рэлігійных лідэраў – гэта ўжыванне ўлады ў пытаннях веры. Нікому з тых, хто прысвяціў доўгія гады сур’ёзнаму роздуму і вывучэнню пісанняў той альбо іншай з вялікіх рэлігій, не патрэбны далейшыя напаміны аб часта паўтараемай аксіёме, якая тычыцца патэнцыйнай магчымасці ўлады разбэшчваць і рабіць гэта ў тым большай меры, чым большай яна робіцца. Неабвешчаныя унутранныя перамогі, якія ва ўсе вякі атрымлівалі незлічоныя духоўныя асобы ў гэтым выпрабаванні, безумоўна, сталі адным з асноўных вытокаў стваральнай сілы арганізаванай рэлігіі, і гэта трэба расцэньваць як адну з яе найвышэйшых адметнасцей. Здача іншых рэлігійных лідэраў спакусам зямной улады і выгады ў той жа ступені стварала багатую ўрадлівую глебу для цынізму, заняпаду і роспачы сярод усіх, хто гэта заўважаў. Тое, як гэта паўплывала на здольнасць рэлігійных лідэраў выконваць іх грамадскі абавязак у гэты момант гісторыі не патрабуе ўдакладненняў.

*

Паколькі мэта рэлігіі – прыдаць высакароднасць характару і пагадзіць узаемаадносіны, яна на працягу гісторыі служыла найвышэйшым аўтарытэтам у наданні жыццю сэнсу. У кожны век яна садзейнічала дабру, ганіла зло і раскрывала позірку ўсіх, хто жадаў бачыць, панараму яшчэ не ажыццяўлёных магчымасцяў. З яе настаўленняў разумная душа атрымлівала падбадзёрванне ў самавыяўленні і ў пераадоленні абмежаванняў сусвету. Як вынікае з яе назвы, рэлігія адначасова стала галоўнай сілай,

якая звязвала розныя народы ва ўсё большыя і складаныя грамадствы, праз што маглі знайсці выяўленне вызваленыя такім чынам асабістыя здольнасці. Вялікая перавага цяперашняга веку – у перспектыве, што дае магчымасць усяму роду людскому ўбачыць гэты цывілізуючы працэс як адзіную з'яву, як сустрэчы нашага сусвету з сусветам Бога, якія паўтараюцца зноў і зноў.

Натхнёная гэтай перспектывай суполка бахаі энергічна садзейнічае міжрэлігійнай дзейнасці з часу яе ўзнікнення. Акрамя песцімых зносін, якія стварае гэтая дзейнасць, бахаі бачаць у імкненні розных рэлігій да збліжэння водгук на Боскую Волю для роду людскога, што ўваходзіць у пару сваёй калектыўнай сталасці. Чальцы нашай суполкі будуць працягваць дапамагаць гэтай дзейнасці як толькі змогуць. Тым не менш, мы павінны ясна выкласці нашым партнэрам па гэтым сумесным намаганням наша перакананне, што для таго, каб межрэлігійнная размова свядома спрыяла вылячэнню хваробаў, якія пашкодзілі страціўшае надзею чалавецтва, зараз трэба шчыра і без далейшага ўнікнення вынікаў прызнаць усеабдымную ісціну, якая выклікала рух да жыцця: што Бог адзін і што, вышэй за ўсю разнастайнасць культурнага выяўлення і людскіх трактовак, рэлігія таксама адзіна.

З кожным праходзячым днём расце небяспека, што полымя рэлігійных прымхаў павялічыцца і запаліць сусветны пажар, вынікі якога цяжка ўявіць. Грамадскія ўлады не змогуць пераадолець гэтую небяспеку без дадатковай дапамогі. Мы не павінны падманвацца, нібыта заклікі да ўзаемнай цярпімасці самі па сабе могуць пагасіць варожасць, якая прэтэндуе на Боскае благаславенне. Крызіс заклікае рэлігійных лідэраў парваць з мінулым гэтак жа рашуча, як парвалі з ім тыя, хто адкрыў грамадству шлях да пераадолення ў роўнай ступені разбуральных расавых, палавых і нацыянальных прымхаў. Служэнне дабрабыту чалавецтва з'яўляецца адзіным апраўданнем для таго, каб уплываць на людзей у пытаннях сумлення. У гэты найвялікшы паваротны момант у гісторыі цывілізацыі не можа быць больш яснага патрабавання такога служэння. «Дабрабыт чалавецтва, ягоны мір і бяспека недасяжныя, – упэўнівае Бахаула, – пакуль ягонае адзінства не будзе цвердa ўсталявана».

СУСВЕТНЫ ДОМ СПРАВЯДЛІВАСЦІ